Мяккасць зычных паказваецца пры дапамозе крэскі над літарай, якая выглядае як націск: loś, hraź, koń, šyĺda, stoĺ.

Е, ё, ю, я пасля зычных перадаюцца спалучэння галосных іе, іо, іu, іa: lios, nie, ziamlia. У пачатку слова, пасля галосных і раздзяляльнага мяккага знака ці апострафа – спалучэннем галосных je, jo, ju, ja: jon, maja, zjava.

Гукі дз і дж у лацінскім варыянце таксама ўяўляюць сабой спалучэнне дзвюх літар (дыграфы) dz і dž, а ддз – спалучэнне трох літар ddz: dzie, chadžu, stahoddzie.

## АСАБЛІВАСЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА Ў IX-XI СТАГОДДЗЯХ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Якубюк С.П., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к. гіст. н., дацэнт, загадчык кафедры Сіткевіч С.А

Полацкае княства з'яўляецца першай дзяржавай на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Першыя летапісныя звесткі пра Полацк адносяцца да 862 года, калі ўзгадваецца прыход варагаў на землі Русі. Але заснаваны горад быў значна раней, аб гэтым сведчаць рэчы, знойдзеныя падчас археалагічных даследванняў гарадзішча. Па гэтых звестках паселішча там ўжо існавала ў VI-VII стагоддзях. Праз некаторы час вакол горада сфармавалася княства. Цэнтрам княства і яго палітычным ядром з'яўляўся горад Полацк.Там знаходзіліся рэзідэнцыя князя, умацаванні і гандлевыя рады, куды прязджалі гандляваць замежныя купцы [1, с.12].

Палітычны лад княства нагадваў лад, які быў у тыя часы ў Кіеве ці ў Ноўгарадзе Вялікім.У тыя часы Полацк адыгрываў значна большую ролю, чым зараз, ён супернічаў за кантроль над гандлёвымі шляхамі з такімі моцнымі гарадамі, як Кіеў і Ноўгарад Вялікі. Таму, магчыма, што іх палітычныя сістэмы трохі падобныя, але маюць свае асаблівасці. Для гэтых сістэм характэрнымі рысамі з'яўлюцца: наяўнасць веча і часам выбарнасць князя, таксама вялікая роля дружыны[2, с.27]. Веча –гэта народны сход усіх мужчын, здольных трымаць зброю, для вырашэння самых важных пытанняў.

У Вялікім Ноўгарадзе веча адыгрывала вельмі значную ролю. Князь павінен быў выконваць усе прынятыя там рашэнні. Таму ў Ноўгарадзе Вялікім, можна казаць, веча кіравала дзяржавай, вырашаючы асноўныя пытанні, князь толькі выконваў іх. У Кіеве больш значную ролю у палітычным жыцці адыгрываў князь з дружынаю, веча прысутнічала, але збіралася рэдка, таму большасць вырашэнняў рабіў князь.У Полацкай зямлі прысутнічалі ўсе гэтыя элементы палітычнага ладу. Веча збіралася і вырашала розныя (найбольш важныя) пытанні, князь меў савет, які яму дапамагаў пры прыняцці нейкіх рашэнняў ці пры падрыхтоўцы прапаноў на новае веча. Таксама князь



Репозиторий ГрГМУ

прызначаў людзей з дружыны на нейкія пасады (тысяцкі, пасаднікі, вірнікі). Гэтыя людзі дапамагалі ў кіраванні княствам, таму што княства на той момант было вялікім і мела ў сваім складзе шмат гарадоў і замкаў. Патрабавалася абараняць гандлевыя шляхі ад ворагаў і разбойнікаў. І таму ў княстве ў X-XI стагоддзях адбываецца цэнтралізацыя ўлады, гэтыя ўмовы спрыяюць развіццю феадалізму ў княстве. У гэты перыяд пашыраецца ўплыў баяр на палітычнае жыцце княства, а таксама і ўплыў Полацкага епіскапа. Таму можна казаць, што ў Полацкім княстве працягваюць развівацца феадальня адносіны.

Аналізуючы гэтыя звесткі, разумеем, что ў Полацкага княства есць некалькі рыс, уласцівых толькі яму: па-першае, веча збіралася рэгулярна, па-другое, у Полацку была свая дынастыя, таму князя не выбіралі на вечавым сходзе, па-трэцяе, князь павінен быў усе значныя пытанні абмеркаваць на вечы. Яшчэ адной асаблівасцю княства з’яўляецца тое, што значную ролю ў палітычным жыцці выконваў епіскап (ён меў права подпісу важных дагавораў і прымаў удзел у вечавым сходзе) [2, с 65]. Таму ў цэлым можна казаць пра тое, што на палітычнае жыцце Полацкай зямлі ўплывалі князь, вечавы сход і епіскап. На падставе гэтага можна казаць, што ў Полацкім княстве існаваў княжацка-вечавы стой са сваімі ўласцівасцямі.

Такі палітычны лад жыцця існаваў у IX-XI стагоддзях, у час росквіту і найбольшай магутнасці Полацкай зямлі [3]. Ён спрыяў эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю княства ў IX-XI стагоддзях.

## ЛІТАРАТУРА:

1. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля / Л. В. Алексеев. – Полоцк : А.И. Судник, 2007. – 50 с.
2. Велько, А. В. Князь Полоцкий Всеслав по прозванию Чародей / А. В. Велько. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 128 с.
3. Летопись по Воскресенскому списку [Электронный ресурс]. –Режим доступа: http://www.psrl.csu.ru/. – Дата доступа: 31.10.2018.

Репозиторий ГрГМУ